странства: коммуникационные и этические проблемы. Материалы научно-практической конференции (26–27 апреля 2013 г.). – М.: Издательство АПК и ППРО, 2013. – 507 с.
9. Дзялошинский, И.М., Дзялошинская, М.И. К вопросу о понятийном аппарате медиаисследований/ И.М. Дзялошинский, М.И. Дзялошинская // Медиаскоп. – 2014. – Выпуск № 4. – [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.mediascope.ru/node/1658. – Дата доступа: 30.01.2017.
10. Каткова, М.В. Понятие «информационное пространство» в современной социальной философии / М.В. Каткова // Известия Саратовского университета. Новая серия. Серия: Философия. Психология. Педагогика. – 2008. – Вып. 2. – с. 23–26.
11. Кедровский, О.В. Информационное пространство России / О.В. Кедровский // Информационные ресурсы России. – 1994. – № 4. – с. 2–3.
12. Медиасистема России / под ред. Е.Л. Вартановой. – М.: Аспект Пресс, 2015. – 384 с.
13. Медиасфера Беларуси. Социологический аспект / Под общей ред. В.О. Дашкевича. – Минск, ИАЦ при Администрации Президента Республики Беларусь, 2014. – 98 с.
14. Основы медиабизнеса: учебник для студентов вузов /под ред. Е.Л. Вартановой. – М.: ЗАО «Издательство Аспект Пресс». 2014. – 400 с.
15. Прохоров, Е.П. Журналистика и демократия / Е.П. Прохоров. – М. РИП-холдинг, 2001. – 268 с.
16. Юдина, Е.Н. Развитие медиапространства современной России (на примере телевидения). Автореферат дисс. на соискание уч. степени доктора социолог. Наук / Е.Н. Юдина. – М., Моск. пед. гос. ун-т, 2008. – 50 с.
17. Якушенко, К.В. Информационный рынок: перспективы его развития в мире и в Республике Беларусь / К.В. Якушенко // Журнал международного права и международных экономических отношений. − 2007. − № 3. – с. 87–92.

**Марына Прахарэня**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

## ГРАМАДСКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ СЕЛЬСКІХ КАРЭСПАНДЭНТАЎ У АКРУГОВЫХ ГАЗЕТАХ БССР

У перыяд з 1924 – 1930 гг. у БССР паспяхова функцыянавала сістэма акруговай прэсы. Дадзены перыяд стаў важным этапам у працэсе станаўлення беларускай рэгіянальнай перыёдыкі, пад час якога была выпрацавана метадалогія яе работы. Нягледзячы на непрацяглы перыяд існавання, акруговая прэса заваявала аўтарытэт у масавага чытача, сфарміравала разуменне палітычнага курса маладой савецкай дзяржавы.

У 1920-я гг. перад акруговым друкам стаяла важная задача – кансалідацыі насельніцтва ў новых умовах грамадска-палітычнага жыцця. Значную дапамогу ў гэтай справе павінны былі аказаць рабселькоры – пазаштатныя карэспандэнты з ліку гарадскіх і вясковых жыхароў. Менавіта з дзейнасці ў акруговых газетах пачынаецца станаўленне рабселькораўскага руху ў Беларусі.

Характэрнай рысай акруговай прэсы з'яўлялася яе скіраванасць у большай ступені на вясковую аўдыторыю. У 1920-я гг. БССР пераважна з'яўлялася аграрнай краінай – 80 % насельніцтва пражывала ў сельскай мясцовасці [1, с. 363]. Таму і акруговыя выданні ў першую чаргу прызначаліся для вясковых жыхароў. Так, у снежні 1925 г. з 6200 экз. газеты Мінскай акругі «Беларуская вёска» (менавіта такі быў разавы тыраж выдання) 5230 экз. распаўсюджваліся ў сельскай мясцовасці [5, л. 23]. У канцы 1924 г. газета «Полоцкий пахарь» (Полацкая акруга) у справаздачы для ЦК КП(б)Б паведамляла: «Газета па свайму характару на 85 % з'яўляецца сялянскай» [6, л. 6].

Ужо з першых месяцаў работы вакол рэдакцый акруговых выданняў удалося арганізаваць значную колькасць сельскіх карэспандэнтаў – аўтарскага актыву з ліку жыхароў вёскі. Так, вясной 1925 г. з газетай «Вясковая праўда» (Слуцкая акруга) супрацоўнічала 148 селькораў [2, л. 164], «Полоцкий пахарь» (Полацкая акруга) – 124 [6, л. 283], «Беларуская вёска» (Мінская акруга) – 178 [3, л. 51].

Газета «Беларуская вёска» адзначала, што «селькор – гэта працоўны селянін (бядняк, серадняк, батрак), які піша ў газету, высвятляе як добрыя, так і дрэнныя бакі вясковага жыцця, вядзе барацьбу з рознымі недахопамі і злачынствамі ў вёсцы, прымае актыўны ўдзел у працы грамадскіх арганізацый вёскі (сельсавета, камітэта ўзаемадапамогі і інш.) і кожнай сваёй нататкай імкнецца палепшыць дабрабыт селяніна» [12].

Функцыі метадычнага забеспячэння дзейнасці пазаштатных карэспандэнтаў з пачатку 1925 г. выконваў бясплатны штомесячны дадатак да «Звезды» – «Спутник селькора», які ў красавіку гэтага ж года стаў самастойным выданнем [там жа, л. 32]. Кіраўніцтва селькораўскім рухам ажыццяўлялася пераважна праз з'езды і канферэнцыі. Так, для каардынацыі дзейнасці мясцовага карэспандэнцкага актыву зімой 1925 г. былі скліканы акруговыя з'езды селькораў. Яны папярэднічалі I Усебеларускаму з'езду селькораў, які прайшоў у Мінску 8 лютага 1925 г. і сабраў 111 дэлегатаў з 10 акруг БССР [там жа]. Старшыня ўрада Беларусі А. Чарвякоў ва ўступнай прамове адзначыў: «Першымі

ластаўкамі беларускай вёскі з’яўляюцца селькоры. Селькор – прадстаўнік сялянства. Аб’яднаць масы вакол партыі, весці іх наперад павінен лепшы селянін-селькор. Друкаванае слова ў руках селькора – моцная зброя барацьбы» [11, с. 117].

Для эфектыўнага кіраўніцтва селькораўскім рухам на з’ездзе было прынята рашэнне аб стварэнні акружных бюро карэспандэнтаў. Аднак у хуткім часе ў сувязі з фінансавымі і кадравымі праблемамі гэтыя ўстановы былі ліквідаваны. Функцыі кааардынацыі дзейнасці селькораўскім рухам было вырашана цалкам перадаць акруговым газетам.

Падчас нарады рэдактараў акруговых выданняў у лістападзе 1925 г. было прынята рашэнне аб арганізацыі і кіраўніцтве гурткамі, якія аб’ядноўвалі селькораў адной вёскі ці сельсавета [4, л. 12]. З кожным годам колькасць такіх гурткоў павялічвалася. Па дадзеных аддзела друку ЦК КПБ(б) у пачатку 1927 г. іх колькасць толькі ў Мінскай акрузе складала 110 [8, л. 73]. Акрамя таго, адукацыйная праца сярод селькораў праводзілася праз куткі селькора, індывідуальную перапіску, адказ на нататкі, інструкцыі, выязныя нарады, якія праводзілі рэдакцыі акружных газет.

Адной з першых арганізавала метадычнае кіраванне селькораўскім рухам газета «Беларуская вёска» (на той момант – выданне Мінскай акругі). 20 кастрычніка 1925 г. у штаце газеты з’явіўся спецыяльны работнік, які павінен быў весці ўлік карэспандэнцкай сеткі Мінскай акругі, ажыццяўляць перапіску, адказваць на допісы, курыраваць дзейнасць селькораўскага кутка, пасяджэнні якога праводзіліся 1 раз на тыдзень [9, л. 117]. Па дадзеных аддзела друку, колькасць селькораў, якія супрацоўнічалі з «Беларускай вёскай», у пачатку 1926 г. складала 126 чалавек [7, л. 5], праз год – у пачатку 1927 г. – 480 чалавек. На гэты момант 231 селькор даслалаў у рэдакцыю анкеты з асабістымі звесткамі. Паводле гэтых дадзеных, можна меркаваць аб гендэрным і ўзроставым складзе пазаштатных карэспандэнтаў «Беларускай вёскі». Так, сярод селькораў выдання было 226 мужчын і толькі 5 жанчын. Селькораў ва ўзросце да 20 гадоў налічвалася 112, ад 21 да 23 – 50, ад 24 да 30 – 54, ад 30 да 40 – 10, звыш 40 гадоў – 5. Асноўны занятак большасці з іх – земляробства [8, л. 52].

У студзені 1927 г. «Беларуская вёска» курыравала працу 19 гурткоў, у склад якіх уваходзілі 223 селькоры. Зімой 1927 г. рэдакцыя газеты правяла нарады з селькорамі ў Койданаўскім, Смілавіцкім, Чэрвеньскім, Пухавіцкім, Смалявіцкім, Заслаўскім раёнах Мінскай акругі, а таксама

Свіслацкім, Жлобінскім і 1-м Бабруйскім раёнах Бабруйскай акругі. З удзелам рэдакцыі праводзілася праверка работы селькораўскіх гурткоў у Круглянскім, Талачынскім раёнах Віцебскай акругі [там жа, л. 53].

У верасні 1928 г. колькасць селькораў, з якімі супрацоўнічала выданне, дасягнула 1,5 тыс. чалавек. Штодзённа газета атрымлівала 500–600 лістоў ад сялян, дзе расказвалася пра жыццё вёскі, а таксама паведамлялася аб злоўжываннях з боку кіраўніцтва сельсаветаў, кааператываў і інш. [10, л. 14]. Толькі ў 1927 г. газета «Беларуская вёска» атрымала каля 20 тыс. карэспандэнцый, з якіх было апублікавана толькі 40 %. У справаздачы для аддзела друку рэдакцыя адзначала: «Гэта адначасова і радасць, і гора. Гора – таму што нельга цалкам выкарыстаць увесь матэрыял» [8, л. 54].

На кожнага селькора заводзілася картка, на якой фіксаваўся змест матэрыялу і час яго атрымання. Лісты селькораў, якія ўтрымлівалі паведамленні аб фактах парушэння з боку ўлады, адпраўлялі ў пракуратуру. Галоўны рэдактар «Беларускай вёскі» Р. Шукевіч-Траццякоў адзначаў, што ў некаторыя дні дасылалася 120–150 допісаў. У перыяд з 25 лютага да 27 красавіка 1928 г. на расследаванне было накіравана 1455 селькораўскіх допісаў. Калі факт парушэння пацвярджаўся, то матэрыял друкаваўся ў газеце [10, л. 16].

Аднак у дзейнасці сельскіх карэспандэнтаў прысутнічаў і адваротны бок. Не заўсёды інфармацыя, якую яны прадстаўлялі, насіла праўдзівы характар. Як правіла, падман выяўляла расследаванне. Так, у адной са справаздач для аддзела друку рэдакцыя «Беларускай вёскі» паведамляла: «Селькор Руды А. з Самахвалавіцкага раёна паведамляў пра хуліганства старшыні сельсавета. Вінаваты сам селькор, якога прыцягнулі да адказнасці. З такімі з'явамі мы вядзём барацьбу шляхам аглашэння ў газеце <…> Быў выпадак, калі селькор у пагоні за ганарарам пісаў допіс раней самаго факта (пра перавыбары сельсавета, калі гэтага яшчэ не адбылося)» [8, л. 178].

Тым не менш, вопыт супрацоўніцтва з акруговымі выданнямі садзейнічаў выяўленню асноўных сацыяльна-прафесійных установак сельскіх карэспандэнтаў – інфармавання аб недахопах у працы савецкіх органаў улады, чыноўнікаў, устаноў, выпрацоўкі прапаноў па найбольш аптымальных шляхах вырашэння праблем. У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь захаваліся дадзеныя аб колькасці і характары крытычнай карэспандэнцыі, якая паступіла ў рэдакцыю газеты «Палеская праўда» (Гомельская акруга) у красавіку – чэрвені 1928 г. Дадзеныя прадстаўлены ў табліцы 1 [10, л. 59].

*Табліца 1*

**Зводка паступлення крытычных нататак і карэспандэнцыі ў рэдакцыю газеты «Палеская праўда» (красавік – чэрвень 1928 г.)**

| Змест крытычных заметак аб дзейнасці | Красавік | Май | Чэрвень | Усяго | Колькасць на расследаванні | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | расследуюцца | расследаваны |
| Савецкага апарата | 183 | 270 | 297 | 750 | 119 | 58 |
| Гаспадарчага апарата | 33 | 37 | 49 | 139 | 21 | 12 |
| Прафесійнага апарата | 47 | 56 | 46 | 149 | 33 | 24 |
| Кааперацыі | 67 | 53 | 60 | 180 | 30 | 15 |
| Партыйнага кіраўніцтва | 86 | 72 | 60 | 218 | 17 | 7 |

Канструктыўная крытыка з боку селькораў была своеасаблівай формай арганізацыі дыялогу паміж грамадствам і прадстаўнікамі ўлады. Дзякуючы публікацыям сельскіх карэспандэнтаў, дзяржаўныя ўстановы пазбаўляліся ад валакіты, спрашчалі справаводства, скарачалі бюракратычны апарат. Грамадства разумела, што праз газету «лягчэй змагацца з усялякай несправядлівасцю» [6, л. 89], а сваё мясцовае выданне ўсё часцей называлі «самым лепшым начальствам» [3, л. 51]. Так, у перыяд з 1 лютага да 1 кастрычніка 1925 г., дзякуючы ўмяшальніцтву рэдакцыі газеты «Наш працаўнік» (Калінінская акруга), жыхарам 7 вёсак знізілі сельсгаспадатак, 23 сялянам-гаспадарам зрабілі зніжку. У 3 выпадках рэдакцыя дабілася адмены пастаноў акруговых арганізацый, у 47 выпадках – раённых і сельскіх [6, л. 89]. У снежні 1926 г. пасля некалькіх крытычных публікацый у газеце «Беларуская вёска» 7 супрацоўнікаў дзяржаўных установаў звольнілі з працы, 3 – атрымалі штраф, 4 – вымову, тлумачальныя запіскі павінны былі пісаць 28 чалавек [8, л. 70].

Такім чынам, на старонках акруговай прэсы рух сельскіх карэспандэнтаў набыў высокую грамадска-палітычную значнасць. На працягу кароткага часу ён вырас у істотную грамадскую сілу, якая часам аказвала значны ўплыў на дзейнасць структур улады, спрыяла ўдасканаленню механізмаў кіравання і фарміраванню грамадскай думкі большай часткі насельніцтва – сялянства. Дзякуючы актыўнаму селькороўскаму руху, органы ўлады актыўна ажыццяўлялі ўзаемадзеянне

з насельніцтвам, вялі адкрыты дыялог, аператыўна рэагавалі на заўвагі, выпраўляючы недахопы ў сваёй працы, выкаранялі бюракратыю.

***Літаратура***


1. Гісторыя Беларусі: у 2 ч. Ч. 2. XIX–XX стагоддзі: курс лекцый / П.І. Брыгадзін, У.Ф. Ладысеў, П.І. Зялінскі і інш. – Мінск: РІВШ БДУ, 2002. – 656 с.
2. НАРБ. – Ф. 4-п, Воп. 1, Спр. 1794
3. НАРБ. – Ф. 4-п, Воп. 1, Спр. 1802
4. НАРБ. – Ф. 4-п, Воп. 1, Спр. 1808
5. НАРБ. – Ф. 4-п, Воп.1, Спр. 2362
6. НАРБ. – Ф. 4-п, Воп. 1, Спр. 2366
7. НАРБ. – Ф. 4-п, Воп. 1, Спр. 2368
8. НАРБ. – Ф. 4-п, Воп. 1, Спр. 2884
9. НАРБ. – Ф. 4-п, Воп. 1, Спр. 2891
10. НАРБ. – Ф. 4-п, Воп. 1, Спр. 3551
11. Слука, А.Г. Беларуская журналістыка (1918 – 1941 гг.) : вучэб.-метад.комплекс / А.Г. Слука, Н.А. Зубчонак. – Мінск : БДУ, 2015. – 191 с.
12. Якія галоўныя абавязкі селькора? // Беларуская вёска. – 1926. – 12 снежня. – С. 3.



**Вікторыя Пяткевіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*


## ЭВАЛЮЦЫЯ СПОСАБАЎ ПАЗІЦЫЯНАВАННЯ КРАІНЫ Ў ГЛАБАЛЬНАЙ МЕДЫЯПРАСТОРЫ

Нацыянальная сістэма СМІ прадугледжвае асобы від дзейнасці, накіраваны на замежную аўдыторыю. Пазіцыянаванне сябе як самастойнага актара на міжнароднай арэне – натуральная неабходнасць любой незалежнай дзяржавы. Большасць дзяржаў у свеце вядуць актыўную інфармацыйную дзейнасць на міжнароднай арэне, удзельнічаюць у абмене інфармацыяй, прычым гэтая дзейнасць пастаянна пашыраецца, мяняюцца яе кірункі, мэты і метады. Гэта звязана з шэрагам эканамічных, сацыяльна-палітычных і тэхнічных фактараў, як у саміх краінах – суб'ектах інфармацыйнай дзейнасці, так і ў свеце. На маштабы сучаснага міжнароднага абмену інфармацыяй істотны ўплыў аказваюць змены, якія адбываюцца ў міжнароднай палітыцы, пашырэнне і паглыбленне ўсіх відаў міжнароднага супрацоўніцтва.

Першыя спробы вяшчання на замежжа былі зафіксаваны ў 20-я гады мінулага стагоддзя, рэгулярная і мэтанакіраваная праца на аўдыторыю іншых краін пачалася на некалькі гадоў пазней і была абумоўлена ідэалагічным супрацьстаяннем краін або неабходнасцю метраполій